# ЖУК Іван Аляксандравіч



Нарадзіўся ў вёсцы Жукі 15 ліпеня 1927 г. у беднай сялянскай сям’і. У бацькоў вырасла восем дзяцей: чатыры дзяўчынкі і чатыры хлапчукі. Хата была нізкай, без падлогі, з саламянай страхой. Але беднасць не мяшала сямейнаму настрою. Старэйшы брат быў музыкантам адзіным у вёсцы, таму ў хаце часта збіралась моладзь на вячоркі. Чыталі вершы. Бацька пісьменніка пісаў сатыру і сам быў выканаўцам. Таму Іван Аляксандравіч з дзяцінства прылажываўся да музыкі і вершаў. Яны яго вельмі захаплялі.

Пачатковую школу скончыў у в. Астухова на польскай мове, а сямігодку – у Заполлі у 1941г. Пры акупацыі Беларусі гітлераўцамі працаваў дома. Тройчы немцы хваталі, каб адправіць працаваць у Германію, але пісьменнік уцякаў. Пасля вызвалення працаваў у ваекамаце пісарам, адкуль пайшоў на вайсковую службу з чэрвеня 1945 г. па лістапад 1952 г. у авіяцыйных часцях па радыёсувязі. Вярнуўшыся дамоў працаваў у калгасе “Новае жыццё” і вучыўся ў Карэлікай вячэрняй школе, якую сканчыў у 1954 г. Адразу паступіў у БДУ на філфак і закончыў яго у 1960 г.

З 1954 г. настаўнічаў у Запольскай школе, дзе працавала і жонка настаўніцай гнаграфіі і нямецкай мовы.

Паэзіяй стаў захапляцца больш сур’ёзна на службе ў арміі. Асабліва паўплывала прырода Каўказа, дзе пісьменнік служыў. Друкаваўся ў раённай газеце “Новае жыццё”, “Полымя”, Гродзенская прўда”, “Настаўніцкая газета”. На многія яго вершы мясцовыя кампазітары напісалі песні.

Першы зборнік паэзіі выйшаў у 1997 г. у Навагрудку. Затым у 1999 г. дзве дзіцячыя кнігі.  У 2001 г. зборнік вершаў “Адзенне душы” і інш.












## Спатканне

У зоры прыбралася неба,
І вечар чароўны паплыў.
Спяшыць на спатканне
Так трэба,
Якое мне лёс падарыў.
Дзяўчына, як кветка, чакае
На беразе ціхай ракі.
Напэўна яна адчувае –
Шчаслівы я сёння які.
Іду па сцяжынцы вясновай.
Наўкола стаіць цішыня,
Шукаю найлепшыя словы
Сказаць для каханае я.
А сэрца надзеяй так б'ецца.
Прыціхла прырода ўся.
На цэлым на свеце, здаецца,
Каханая толькі і я...

# Рукі жанчыны

На іх гляджу з даверам,
З павагаю заўжды...
Прыгадваю міжволі
Суровыя гады.

Вайна наўкол грымела,
Салдаты бой вялі...
Жанчынаў рукі ўмела
Жыццё іх берaглі.

Павязкі туга клалі
На раны змагароў,
Са смерцю ваявалі
Мо тысячы разоў.

Дранцвелі ў траншэі,
На ветры ледзяным.
Свінцовыя завеі
Былі не страшны ім.

Усё яны ўмелі.
Рабілі ўсё Яны.
Спакою не цярпелі
У грозны час вайны.

## ВІТАЮ ДЗЕНЬ

Вітаю кожны дзень вясновы,
Высокі сонечны блакіт,
А гэта росквіту аснова,
Прыроды краю каларыт.

Вось ранак крочыць, расцвітае,
Дужэе, поўніцца жыццём,
Ён мары нашыя ўслаўляе
Ды дружыць з краю харaством.

А людзі ў ім, бы тыя пчолы,
Спакой мацуюць, дабрабыт,
Звінела радасць каб наўкола,
Каб шлях да шчасця быў адкрыт.

Вітаю дзень, вясну вітаю,
Яе прывабнасць, прыгажосць.
Няхай яна людзей яднае,
Здароўе дарыць, маладосць!

# Карэліцкі край

Карэліцкі край,
Ты чаруеш наўкола
Садамі цудоўнымі,
Дружбай людской,
Палямі, дзе збожжа
Калосіцца ў долах,
Лугоў аксамітных
Прывабнай красой.
Карэліцкі край,
Ты вядомы наўкола
За лён сінявокі,
Што морам шуміць,
За звонкія песні
Ансамбляў і хораў,
З якімі святлей
Працаваць нам і жыць.
Карэліцкі край,
Твой і цэнтр прыгажэе,
Расце ў шырыню
І не менш – ў вышыню.
Твой шлях гістарычны
З гадамі ярчэе
Ды повен энергіі,
Веры, агню.
Карэліцкі край,
Я шчыра вітаю
Герояў і Працы,
Герояў вайны.
Ды светлага лёсу
Працоўным жадаю,
Каб жыццё бушавала,
Як квецень вясны.